Наш край у XIX — пачатку XX ст.

1. Работа ў міні-групах. Выкарыстоўваючы карты, матэрыял вучэбнага дапаможніка і гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» вашага раёна, вызначце:

А) у склад якіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак уваходзіў ваш населены пункт у XIX — пачатку XX ст.; якім быў і як змяніўся яго статус;

Б) якія гістарычныя падзеі і якім чынам закранулі жыхароў вашага населенага пункта, раёна.

Прэзентуйце вынікі сваёй работы класу, параўнайце з вынікамі іншых міні-груп. Падрыхтуйце агульную прэзентацыю «Мая малая радзіма ў XIX — пачатку XX ст.».

2. Экскурсія па родным краі. З дапамогаю гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» і дадатковых крыніц даведайцеся, якія будынкі XIX — пачатку XX ст. захаваліся ў вашым населеным пункце. Падзяліце іх на катэгорыі: прамысловыя аб'екты, храмы, установы адукацыі, жылыя дамы і інш. Даведайцеся, як яны выкарыстоўваюцца сёння. Складзіце план экскурсіі па вуліцах населенага пункта «Мой горад (мястэчка, вёска) у XIX — пачатку XX ст.».

3. Славутыя землякі. З дапамогай гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» і дадатковых крыніц даведайцеся, жыццё і / або дзейнасць якіх славутых людзей XIX — пачатку XX ст. звязаныя з вашай мясцовасцю. Знайдзіце, калі гэта магчыма, іх успаміны або творы пра ваш край. Прэзентуйце вынік свайго даследавання ў выглядзе калажа або інфаграфікі.

4. Мая сям'я. Даведайцеся пра гісторыю сваёй сям'і ў XIX — пачатку XX ст.: імёны прабабуль і прадзедаў, дзе жылі, чым займаліся, які ўдзел бралі ў гістарычных падзеях. Выкарыстайце пошукавыя сайты, напрыклад, Памяці герояў вялікай вайны 1914–1918 (https://gwar.mil.ru/) для пошуку звестак пра сваіх продкаў.

Падрыхтуйце аповед пра лёс сваёй сям'і ў XIX — пачатку XX ст.